Ад *мяха* пайшлі потым і мадэрныя сумкі, і бавулы, і розныя ахіналы.

Пастухоў і вандроўнікаў *мех* ратаваў ад дажджу, ад морасі, ад пылу.

Капюшоны ўсіх фасонаў — унукі *мяха*, а торбачкі — як бы дачушкі.

З маленства гучыць мне весялінка: „*Ажаніўся* мяшок, *узяў торбачку, туды-сюды павярнуў — цмок у мордачку!*"

Ад *мяха — мяшэчнікі*, тыя бедалагі, якіх голад крывавых рэвалюцыяў і войнаў гнаў па сьвеце. Пасьля вайны ўдовы — прыгоньніцы калгасаў — на сваіх плячах несьлі першы мірны ўраджай у *мяхах*. *Мех* быў адзінкай вымярэньня — *мех мукі, мех жыта, мех бульбы...*

Падчас паўстаньняў, барацьбы беларусаў за волю *мяхі*, насыпаныя пяском, былі надзейнымі сьценамі змагароў.

Адказная і шанавітая, так бы мовіць, пасада *механошы*, валачоўнікаў і скамарохаў.

У паэтаў „*мех*" гукае рыфму на „сьнег" і „сьмех". Пра недакладную многасьць кажуць — „*мех з торбачкай*", пра марныя намаганьні — „*чубяцца за мех, а ў мяху — сьмех*". Ён — нясумны мэтад кайнасьці: „*Грэх — у мех, а сам — наверх*".

Завязаны пад самае горла *мех* нагадвае сноп. Не такая і далёкая радня — абодвум зярняты дарагія.

# Меч

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Меч* — адзін з элемэнтаў нашага нацыянальнага гербу „Пагоня" і знак вялікакняскай улады ў Вялікім Княстве Літоўскім. Выявы *мяча* пачасту сустракаюцца на гербах беларускае шляхты.

На адным з праектаў гербу бальшавіцкай дзяржавы таксама быў *меч*, які быццам бы Ленін загадаў прыбраць, каб паказаць міралюбны характар бальшавікоў, маўляў — „*перакуём мячы на аралы*". Скасаваны так званым правадыром *меч* ім жа самім і быў укладзены ў рукі ЧК, пасьля чаго гэтую зброю пачалі называць *карным мячом рэвалюцыі*. 70 гадоў ён лютаваў у Беларусі паводле прынцыпу „*Мой меч — твая галава з плеч*".

*Скрыжаваць мячы. Падняць меч. Прыйсьці зь мячом. Дамоклаў меч.*

*Мечнік* — службовая асоба і ганаровае званьне ў Вялікім Княстве, а таксама ваяр зь *мячом* і збройнік, які вырабляў гэты тып узбраеньня.

*Меч, мечападобны, мячовы, мечаваты.*

Вобраз *мяча* — адзін з асноўных атрыбутаў вуснае народнае творчасьці. „Я ж тых маскалёў *мячом* пасяку" — сьпяваюць сьвяточнымі зімовымі вечарамі калядоўшчыкі.

*Мечыслаў* — беларускае імя, у якім чуецца: *мечаны* славай альбо ўслаўлены *мячом*.

„*Біце ў сэрцы іх — біце* мячамі, *не давайце чужынцамі быць!*" — напісаў у вечна надзённым вершы „Пагоня" Максім Багдановіч.

# Міліцыя

***Рыгор Барадулін***

*Міліцыя* — з лаціны, дзе *militia* — войска.

Хадзіў анэкдот — навічку-*міліцыянту* заданьне: прыдрацца, прычапіцца